# Мая Радзіма – Беларусь

Шока Канстанцін, дзяржаўная установа адукацыі "Сярэдняя школа №27 імя В.В.Юртава г. Гродна", V "Д" клас

У маім пакоі света і ўтульна. На стале ляжаць каляровыя алоўкі і разгорнутая контурная карта. Гэта апошняе заданне на сёння. Выканаю – і можна пайсці пагуляць з сябрамі.

Спачатку вазьму чырвоны аловак, каб абвесці мяжу Беларусі. Вяду лінію асцярожна і пры гэтым разважаю: як жа добра сышлося, што краіна наша сваімі абрысамі нагадвае лісток! І сапраўды, шмат у нас лясоў і пушчаў, дзе звяры і птушкі жывуць вольна, а людзі прыходзяць у госці па багатыя дарункі: па драўніну, грыбы і ягады, лекавыя расліны і добрыя ўражанні. Летам мы з дзядулем часта ходзім у лес па лісічкі і баравікі. Вясной і восенню гуляем з бацькамі ў парку Жылібера, па сцяжынках Румлёўскага лесапарку і ў Пышках. У такія моманты я заўсёды адчуваю радасць ад таго, што прырода Беларусі такая разнастайная і зменлівая. Далёка не кожная краіна можа пахваліцца чатырма порамі года. А ў нас ёсць халодная беласнежная зіма, сакавітая салаўіная вясна, зялёнае квяцістае лета, багатая залатая восень. І кожная пара непаўторная і цудоўная!

Зноў вяртаюся да работы. Зараз алоўкам блакітнага колеру трэба падпісаць самыя буйныя рэкі і азёры. Вось магутны Дняпро, па якім калісьці плылі лодкі вікінгаў. На поўначы праз Полацк і Віцебск імкліва бяжыць Заходняя Дзвіна. Магчыма, недзе на дне там ляжыць крыж Еўфрасінні Полацкай і чакае, што яго адшукаюць? На поўдні павольна цячэ Прыпяць. Вельмі спадабалася мне адпачываць на яе пясчаных пляжах, купацца ў цёплай вадзе і есці смачную юшку з прыпяцкага шчупака. Але асаблівую павагу ў мяне выклікае Нёман. І няхай выток яго знаходзіцца ў Мінскай вобласці, менавіта на Гродзеншчыне Нёман становіцца велічнай ракой з хуткай халоднай плынню і стромкімі берагамі.

Па ўсёй нашай зямлі раскданы вялікія і малыя азёры і сажалкі, вадасховішчы і нават каналы. Нарач, Свіцязь, Сялец, Чырвонае, Асвейскае… Госці Беларусі захапляюцца іх прыгажосцю і з цікавасцю слухаюць легенды, звязаныя з гэтымі мясцінамі. На ўроках роднай літаратуры мы таксама знаёмімся з легендамі, казкамі, песнямі і народнымі абрадамі. І, можа, не ўсе ўважліва слухаюць настаўніка, але кожны разумее, што беларуская культура самабытная і яркая. Нам ёсць чым здзівіць суседзяў і гасцей. І трэба берагчы і шанаваць нашу культурную спадчыну.

Апошняе заданне самае простае: трэба падпісаць сталіцу Беларусі і горад, у якім ты жывеш. Вось у самым цэнтры краіны Мінск. Гэта самы вялікі і прыгожы беларускі горад. Ён старажытны і сучасны адначасова. Я некалькі разоў прыязджаў у Мінск і вельмі люблю гуляць па яго шырокіх светлых вуліцах. Столькі паркаў і сквераў няма больш нідзе. Мінскі батанічны сад па плошчы займае трэцяе месца ў Еўропе, а па прыгажосці я б аддаў яму першае.

Засталося падпісаць мой родны горад Гродна. Вось ён, каля заходняй мяжы Беларусі. Турысты лічаць яго адным з самых каларытных і прыгожых гарадоў нашай краіны з яго своеасаблівай архітэктурай і непаўторнай Барысаглебскай царквой. Я жыву тут з нараджэння, таму часам не заўважаю, які ён цудоўны. Але я вельмі люблю свой горад і з гонарам называю сябе гродзенцам!

Заданне выканана. Контурная карта займае сваё месца ў школьным рукзаку. Я нарэшце спяшаюся да сяброў. На душы ў мяне радасна і светла!